больш кароткая (у асноўным тры-чатыры радкі), а таксама большасць квантэм заснавана на такіх прыёмах гукапісу, як алітэрацыя і асананс.

Пра такія свае паэтычныя формы, як вершаказы і зномы, А. Разанаў піша: «Мне ўяўляецца, што такая форма тоіць у сабе багатыя магчымасці: у ёй могуць арганічна спалучацца і лірычнае ўзрушэнне, і фабула, уласцівая апавяданню, і філасофская сентэнцыя, і эксперыментальны свет антыўтопіі навуковай фантастыкі...» [1, с. 13].

Зыходзячы з асаблівасцей страфічнай арганізацыі, да верлібравых жанраў можна аднесці квантэмы і пункціры, а да версэйных — версэты (разам з паэмамі ў прозе) і вершаказы. Даследуючы стогадовую гісторыю і эвалюцыю версэ, некаторыя даследчыкі (Ю. Арліцкі, Г. М. Кісліцына і інш.) нават не разглядаюць магчымасць змешаных рысаў версэ і верлібру. Разанаўскі ж версэт, на нашу думку, — прыклад менавіта такога «змяшэння». Пры гэтым назіраецца набліжанасць версэта да прытчы, з якой іх яднае, перш за ўсё, увага да архетыповых з'яў жыцця і пэўная адсутнасць развітога сюжэтнага руху. Як і прытчы, версэты пазбаўлены апісальнасці мастацкай прозы: прырода і рэчы нагадваюцца толькі па неабходнасці, дзеянне адбываецца быццам без дэкарацый, а дзеючыя асобы не маюць не толькі знешніх рыс, але і характару.

Структурны разгляд версэта выяўляе, што яго закончанасць і цэласнасць, сама логіка аповеду, якія набліжаюць версэт да міні-апавядання, поруч з выкарыстаннем стылістычных прыёмаў і верлібравых рытміка-інтанацыйных складнікаў сведчаць пра жанравы сінкрэтызм версэта.

Для вершаказа характэрны строгая падзеленасць на строфы, пераважная адсутнасць унутраных паўзаў і вынесеных радкоў. Яны маюць структуру, блізкую да версэта: тая ж падзеленасць на строфы, версэйная арганізацыя тэксту, наяўнасць сказу-выніку, а па форме набліжаюцца да паэтычных твораў. Але галоўнае адрозненне паміж версэтам і вершаказам, апроч скразной гукаапісальнасці апошніх, з'яўляецца адсутнасць у вершаказах рытміка-інтанацыйных і сінтаксічна-інтанацыйных прыёмаў (паралелізмаў, градацыі, паўтораў, рытарычных фігур і інш.). З фармальнага пункту гледжання вершаказ ўяўляе чаргаванне пэўных сінтаксічных канструкцый (строф) як аднатыпных інтанацыйна-сэнсавых адзінстваў з рознымі адносінамі (звычайна супрацьпастаўлення). Пры гэтым, нягледзячы на адсутнасць традыцыйных рытміка-метрычных складнікаў творы гэтай эксперыментальнай формы гарманічна ўкладаюцца ў эстэтычную сістэму А. Разанава як паэтычныя праз такія прыёмы, як алітэрацыя і асананс, унутраную рыфмоўку, шырокае выкарыстанне аказіянальнай лексікі, адмысловую манастрафічную пабудову.

Такім чынам, ужо каля 20 год імя Разанава сімвалізуе нястрымны творчы пошук, эксперыментатарства. Уведзеныя ім новыя паэтычныя формы — квантэмы, пункціры, версэты, вершаказы, зноны — не толькі зрабілі нашу паэзію больш разнастайнай, але і паўплывалі на характар яе далейшага развіцця, стаўшы візітнай карткай новага пакалення пісьменнікаў (А. Сыс, А. Мінкін, І. Бабкоў, В. Слінко, А. Глобус, А. Аркуш, М. Шайбак, С. Вераціла, Ю. Пацюпа, Ю. Гумянюк і інш.).

**Спіс крыніц**


1. *Кісліцына, Г. М.* Алесь Разанаў: Праблема мастацкай свядомасці / Г. М. Кісліцына. — Мн. : Беларуская навука, 1997. — 143 с.
2. *Міхневіч, А. Я.* Чарадзеі роднага слова. 40 моўных партрэтаў бел. пісьменнікаў: дапаможнік — хрэстаматыя па курсах «Сучасная бел. мова», «Стылістыка бел. мовы» / А. Я. Міхневіч. — Мн. : МДЛУ, 2006. — 176 с.
3. *Караткевіч, У.* Алесь Разанаў. Шлях — 360 / У. Караткевіч. — Мн. : Мастацкая літаратура. — 1981. — 108 с.


Материал поступил в редакцию 03.11.2011 г.

***Н. У. Здановіч***
*Навуковы кіраўнік* —А. І. Белая,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## МАТЫЎ ШЛЯХУ Ў ТВОРАХ Я. КУПАЛЫ

Матыў шляху ў сістэме каштоўнасцяў мастацкага выказвання ўтварае арэал досыць шырокага ўжывання. Ён «здаўна ўваходзіць у знакавы склад самых першасных і разам з тым самых распаўсюджаных моваў, якімі паслугоўваецца чалавецтва пры тлумачэнні, адлюстраванні і ўвасабленні светабудовы» [3, с. 152].

Матыў шляху ўключае ў сябе шэраг гуманітарных аспектаў. Так, Т. Б. Шчапанская ўводзіць у сувязі з гэтым такое паняцце, як «культура шляху». Пад «культурай шляху» [4, с. 8] разумеецца комплекс этнічных традыцый — звычаяў і нормаў паводзін, рэчыўных атрыбутаў і ўяўленняў, звязаных з перамяшчэннямі. Да іх адносяцца: матэрыяльная (прыдарожнае жыллё, дарожная адзежа і рознага роду рэчыўныя атрыбуты, ежа, сродкі перамяшчэння), духоўная (абрады і ўяўленні), сацыенарматыўная культура (статусы і нормы паводзін вандроўных людзей).

У адносінах да ўніверсальнасці матыву шляху ў кожнага значнага творцы складваецца свая індывідуальная паэтыка. Мастацкае выказванне «набывае адметную «пячатку майстра», і пэўны набор стылістычных фігур і паэтычных прыёмаў устойліва захоўваецца некаторым апазнавальным знакам на працягу ўсёй творчай дзейнасці» [3, с. 156].



Репозиторий БарГУ

Як адзначаюць даследчыкі, у творчасці Янкі Купалы вершаў, якія толькі ў загалоўку ўтрымліваюць канцэпт шляху ці дарогі, назбіраецца на добрую паэтычную кнігу, нават адзін са зборнікаў і носіць назву, якая мае названы матыў — «Шляхам жыцця» [3, с. 188].

Матыў шляху, дарогі ў творах Я. Купалы можа перадаваць аптымізм, у некаторай ступені эмацыянальную закліканасць, але можа мець і мінорнае гучанне, рэпрэзентаваць настрой безнадзейнасці. Так, у вершы «Перад будучыняй» метафарычны шлях паўстае жабрацкім; па ім брыдуць, абапіраючыся на кіі, сляпыя падарожныя: «Аграбленыя з гонару ў кашулі, / З свайго прыпынку выгнаныя вон, / Мы дзякуем, што торбы апранулі / На нас ды з нашых нітак-валакон. / З кійком жабрачым так мы, паўналеткі, / Брыдзём, паўзём у свет — скрозь неўпапад. / І прысягаем, клічам Бога ў сведкі, / Што мы — не мы, што нехта вінават…» [6]. У нашаніўскай паэзіі Я. Купалы міфалагема шляху рэалізуецца ў вобразах сцежкі, дарогі, гасцінца, пуцявіны, следу, Млечнага Шляху. З імі ў гэты перыяд звязаны вобразы вандроўнікаў, матывы беззямельнасці, бездарожжа, блукання (вершы «Беззямельныя», «Старцы», «Прарок», «Чатыры крыжы» і інш.).

Вандроўныя старцы звычайна выступаюць заступнікамі духоўнасці (моляцца за ўсіх), носьбітамі мудрасці (з'яўляюцца добрымі дарадчыкамі), своеасаблівымі гарантамі маральнага дабрабыту людзей. Але ў вершы «Старцы» паэт падкрэслівае непрывабнасць герояў, у тым ліку і ў іх паводзінах: «Быццам горбы, іхні торбы / Выдаюць парад; / На кірмашы старцы нашы / Садзяцца ў рад. / Кожны прэцца ў лепша мейсца…» [5]. Іх маленне «за змарлыя, за жывыя / Душкі, за жыццё, / За скацінку, за збажынку / І за ўсё, за ўсё…» з'яўляецца толькі знешнім атрыбутам, бо думкі герояў на самай справе аб іншым: «Гэй, малітвам, быццам бітвам, / Стар'ё аддалось, / А з-пад воку глядзяць к боку, / Ці дадуць хто штось…» [5].

У драматычным творы, у прыватнасці ў драме «Раскіданае гняздо», матыў шляху раскрываецца ў іншым значэнні: шлях — выбар духоўных і жыццёвых арыенціраў. У адносінах да сутнасці шляху ў названай драме І. В. Жук ўводзіць тэрмін «ініцыятыўная метафара»: «Ініцыятыўная метафара — узровень падсвядомай паэтыкі. Яе сутнасць складае некаторая іншасказальная формула вобразна аформленага (праз пэўныя мастацкія прыёмы, матывы, топасы) чалавечага вопыту, рэальна здзейсненага ці ўяўнага, ажыццёўленага ці толькі жаданага, высненага <…> Ініцыятыўная метафара зместам сваім пранікае ў прасвядомасныя глыбіні архаічнага светасузірання, пакінуўшы па сабе ад шматлікіх сваіх папярэдніх выяўленняў толькі агульную схему ўспрыняцця» [3, с. 205]. Для матыву шляху ў драме Я. Купалы «Раскіданае гняздо» І. В. Жук выводзіць сэнсавую метафару, якая выяўляецца формулай праз трыяду «страта — пошук — набытак». У гэтай драме матыў шляху выяўляецца якраз падобна да гэтай формулы — пошук, выбар дальнейшага жыцця героямі, а таксама і праз вандроўныя вобразы Старца і Незнаёмага. Вобраз Незнаёмага нясе ў сабе ідэйную, палітычную скіраванасць, заклік да новага жыцця, да зменаў у грамадстве. Вобраз Старца выражае ў драме талерантнасць, пакорлівую цярплівасць да ўсяго, хрысціянскую мараль. Паводле М. Гарэцкага, «старац сімвалізуе старадаўняе прымірэнне з бядою». На думку ж А. Адамовіча, «рэпліка Старца, якою адкрываецца п'еса — «Так, так, пані гаспадыня! Заўсёды бяда бяду вядзе, але ніколі не трэба здавацца» − адразу і катэгарычна пярэчыць якому б там ні было «прымірэнню з бядою», а натхнёная рытарычная «ганьба», якая прамаўляецца ім ў апошняй дзеі — «Ганьба таму чалавеку, што рукі апусціць, як перавяслы, і чакае, пакуль сама доля к яму прыйдзе ў хату і папросіцца, каб прыняў яе з ласкі свае! Ганьба таму, хто, вочы на ўсё заплюшчыўшы, будзе ісці ўцёртай здавён сцежкай няпраўды і бяспраўя, думаючы, што іначай быць ніколі не можа і што не ў яго волі змяніць стары парадак бессумленнага жыцця! Ганьба таму…» — канчаткова мусіць адкінуць думку аб нейкім Старцавым «прымірэнні». Калі і дапускае Старац нейкае «прымірэнне», то толькі для «старых», што «дажываюць» («маладыя ж мусяць нечага шукаць, нечага дабівацца»), ды і то гэта — не «прымірэнне», а прыняцце, пры гэтым і не «бяды» ці «старога быту», а самога жыцця…» [1, с. 426]. Увогуле, як сцвярджае А. Адамовіч, у драме «Раскіданае гняздо» паказаны тры шляхі выхаду з «раскіданасці»: «Лявон рэпрэзентуе сабою выхад з жыцця ў смерць, Старац — выхад з жыцця ў жыццё, якое прымаецца ў ягонай усеабсяжнасці, выхад шукання праз вандраванне «з свету ў свет», праз старцаванне, але «без лішняй жабрацкай жаласлівасці»; Незнаёмы — выхад праз «вялікі сход». Усе гэтыя выхады пералічваюцца ў рытарычна-пытальнай форме ў вершы «Над Свіслаччу» са зборніка «Шляхам жыцця»: «Сам сабой не знаеш, што рабіць, / Як жыць… ці сніць, / Ці пайсці гасцінцам долі ў свет шукаць, / Ці рачцэ, русалкам галаву аддаць» [1, с. 428-429]. І Старац, і Незнаёмы скіроўваюць Марылю разам з дзецьмі да выгнанніцтва, жабрацтва. На думку П. Васючэнкі, «жабрацтва — гэта асабліва сацыяльны, духоўны, псіхалагічны стан, які звязаны не толькі з вобразамі парадку «хата — шлях», але і са стасункамі Маладой і Старой Беларусі». Крытык лічыць, што жабрацтва тут не выглядае як суцэльнае прыніжэнне; у нечым яно якраз сімвалізуе разняволенасць, выратаванне ад страху страціць сваё жытло, працу, кавалак хлеба, падчас якога духоўныя сілы чалавека могуць скіроўвацца да іншых, ідэальных субстанцыяў [2, с. 130].

Такім чынам, шлях як універсальны, архетыпавы матыў яднае ў сабе мінулае і сучаснасць, скіроўвае герояў у будучыню. У розныя перыяды творчасці Я. Купалы і ў творах паэта розных жанраў матыў шляху меў адметнае значэнне, ідэйна-мастацкае выражэнне, рэпрэзентаваў разнастайныя жыццёвыя пазіцыі: як жыццёвыя выпрабаванні, што неабходна пераадольваць героям, так і экзістэнцыйны выбар, агульную стратэгію лёсу.

**Спіс крыніц**


1. *Адамовіч, А.* Да гісторыі беларускае літаратуры / А. Адамовіч. — Мн. : Выдавец ІП Зьміцер Колас, 2005. — 1 464 с.
2. *Васючэнка, П.* Драматычная спадчына Я. Купалы : вопыт сучаснага прачытання / П. Васючэнка. — Мн. : Навука і тэхніка, 1994. — 173 с.


Репозиторий БарГУ

3. *Жук, І. В.* Матыўная прастора літаратуры пачатку XX стагоддзя : манагр. / І. В. Жук [і інш.] ; пад агул. рэд. І. В. Жука. — Гродна : ГрДУ імя Я. Купалы, 2009. — 255 с.
4. *Щепанская, Т. Б.* Культура дороги в русской мифоритуальной традиции XIX—XX вв. / Т. Б.Щепанская. — М. : Индрик, 2003. — 526 с.
5. Режим доступа : rv-blr.com/vershu/view/35523
6. Режим доступа : www.rv-blr.com/vershu/view/903

Материал поступил в редакцию 03.11.2011 г.

***В. М. Майсюк***
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ЎРОКАХ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Арганізацыя самастойнай пазнавальнай дзейнасці на ўроках мовы і літаратуры займае важнае месца ў сучаснай методыцы, так як у выніку правільнага правядзення вучань набывае дастатковыя веды, выяўляе свае інтэлектуальна-пазнавальныя і творчыя магчымасці. Менавіта арганізацыя самастойнай пазнавальнай дзейнасці на ўроках мовы і літаратуры з'яўляецца адным з самых даступных і праверaных на практыцы шляхоў павышэння эфектыўнасці навучання, актывізацыі дзейнасці вучняў.

Вядомыя метадысты і педагогі-практыкі (М. А. Лазарук, В. Я. Ляшук, А. В. Руцкая і інш.) не раз падкрэслівалі, што навучальны патэнцыял павялічваецца, калі вучні працуюць самастойна, а настаўнік — кіруе іх дзейнасцю, прапаноўвае пытанні і заданні, дае неабходныя тлумачэнні, спрыяе развіццю ўмення самастойна мысліць і выказваць свае думкі. Але трэба адзначыць, што на ўроках не заўсёды настаўнік арганізоўвае прадуманую сістэмную арганізацыю самастойнай працы, якая накіравана на фарміраванне ўменняў, засваенне прыёмаў пазнавальнай і даследчай дзейнасці школьнікаў, што прадугледжвае выкарыстанне набытых ведаў на практыцы.

Як адзначана ў адукацыйным стандарце, вядучай мэтай вывучэння беларускай мовы і літаратуры з'яўляецца фарміраванне ў вучняў сістэмы ведаў пра мову і маўленне, навучанне карыстанню беларускай мовай ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо); развіццё інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры вучняў, а рэалізацыя дадзенай мэты магчыма пры правільнай арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках [1].

Паняцце «самастойная вучэбная дзейнасць» прадугледжвае арганізацыю настаўнікам актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў, у ходзе якой рэалізуюцца пастаўленыя дыдактычныя мэты і задачы. Самастойная праца як дыдактычная з'ява ўяўляе сабой, з аднаго боку, вучэбнае заданне для вучня, а з другога — форму праяўлення гэтай дзейнасці (памяць, мысленне, творчы падыход пры выкананні задання), якая садзейнічае атрыманню новых ведаў або паглыбленню ўжо вядомага і ўзбагачае індывідуальна-творчы досвед.

Такім чынам, самастойная праца — сродак навучання, які, па-першае, у канкрэтнай сітуацыі засваення ведаў адпавядае пэўнай канкрэтнай мэце; па-другое, фарміруе ў вучня на кожным этапе неабходны аб'ём і ўзровень ведаў, уменняў і навыкаў для вырашэння пазнавальных задач і стымулюе мысліцельную дзейнасць; па-трэцяе, выпрацоўвае ў вучняў псіхалагічную ўстаноўку на самастойнае сістэматычнае пашырэнне і ўдасканаленне сваіх ведаў, выпрацоўку ўменняў арыентавацца ў навуковай і літаратуразнаўчай інфармацыі пры вырашэнні пастаўленых задач.

Даследаванні вучоных, метадыстаў, педагогаў і псіхолагаў дазваляюць вызначыць некалькі ўзроўняў самастойнай дзейнасці вучняў, якія адпавядаюць іх інтэлектуальна-пазнавальным магчымасцям:

– капіраванне дзеянняў па пэўным узоры, іх усведамленне шляхам параўнання з ужо знаёмымі прыёмамі працы (на гэтым узроўні адбываецца падрыхтоўка да самастойнай працы);
– рэпрадуктыўная дзейнасць па ўзнаўленні інфармацыі пра розныя ўласцівасці вывучаемага матэрыялу на ўзроўні назапашаных ведаў;
– прадуктыўная дзейнасць па самастойным выкарыстанні набытых і назапашаных ведаў для вырашэння новых і невядомых задач;
– самастойная дзейнасць, якая рэалізуецца праз пошукава-пазнавальную працу пры вырашэнні новых задач [2—4].

Вучоныя вылучаюць асноўныя патрабаванні да арганізацыі самастойнай дзейнасці школьнікаў на ўроку:

– неабходна паставіць канкрэтную мэту перад вучнямі і вызначыць пэўны парадак і прыёмы выканання заданняў;
– дзейнасць павінна адпавядаць вучэбным магчымасцям і індывідуальным здольнасцям вучня;
– ступень складанасці самастойнай працы павінна забяспечваць паступовы пераход на больш высокі ўзровень;
– неабходна забяспечыць спалучэнне розных відаў самастойнай працы, а таксама кіраванне гэтым працэсам;
– варта спрыяць развіццю пазнавальных здольнасцей, ініцыятывы ў прыняцці пэўных рашэнняў, даследчых уменняў і навыкаў, творчасці ў працэсе навучання;
– мэтазгодна пазбягаць шаблоннасці, рыхтуючы заданні і пытанні да ўрока;
– праз змест працы імкнуцца выклікаць у вучняў цікавасць і жаданне давесці справу да канца;
– неабходна арганізаваць самастойную дзейнасць так, каб яна ператварылася ў імкненне і звычку пастаянна працаваць і ўдасканальваць свае веды.